# НАВАПОЛАЦК ІЗНОЎ НОВЫ. ВЕРСІЯ 2.0

**Дакумент па пераўтварэнні горада аналагічны полацкаму, аднак ён мае і сваю спецыфіку. Трансфармаванне скіравана на павышэнне прывабнасці горада як месца для жыцця, работы, інвеставання на аснове рэалізацыі нацыянальных прыярытэтаў развіцця, забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту і паляпшэння якасці навакольнага асяроддзя.**

Актуальнае развіццё Наваполацка да 2040-га ставіць у прыярытэт задачы зрабіць горад папаўняльным, разумным, зручным. Распрацавана транзітна-арыентаваная мадэль узаемаўвязвання старых і новых цэнтраў у маштабе рэгіёна. Яна прадугледжвае агламерацыю Полацка і Наваполацка вакол цэнтра існуючага Наваполацка на вуліцы Маладзёжнай.

У плане прапісана рэалізацыя чатырох тэм. Гэта фарміраванне адзінай водна-зялёнай сістэмы; развіццё інфраструктуры эканомікі замкнёнага цыкла; павышэнне камфортнасці пражывання з дапамогай разумных тэхналогій; транзітна-арыентаванае развіццё.

У сучасным дзявятым мікрараёне Наваполацка не выкарыстоўваецца дзве трэціны з 27 гектараў яго плошчы. Тут можна дадаткова пасяліць яшчэ 3000 жыхароў, і ў выніку 10 % горада будзе жыць у адным раёне. Шчыльнасць насельніцтва пры гэтым узнімецца да максімальных паказчыкаў (хоць Наваполацк і так чэмпіён па гэтым крытэрыі), затое паверхавасць дамоў знізіцца ад васьмі да чатырох з паловай, лічаць эксперты.

Трансфармаваць прастору тэрыторый Наваполацка, якія знаходзяцца ў чарзе на капрамонт, паспрабавалі студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Цэнтра ўрбаністыкі і дызайну (ЦУД).

У горадзе шмат дрэў і вялікі патэнцыял, аднак тэрыторыя не запатрабавана жыхарамі, а ўсе пешаходныя прасторы — у профілі вуліц. Скверы і іншыя зялёныя кавалачкі, якія першапачаткова закладваліся праекціроўшчыкамі мікрараёнаў, так і засталіся кавалачкамі, куды максімум дасаджваюцца дрэвы. Грамадскія прасторы не інтэграваны ў сістэму гарадскога цэнтра і не спакушаюць людзей рухацца пешшу, нават гуляць з дзіцячай каляскай можна толькі ўздоўж магістральнай вуліцы Маладзёжнай.

— Пры гэтым ёсць магчымасць уключыць у сістэму «зялёных» зносін увесь горад. Планіровачная структура горада, якая склалася, мае вялікі патэнцыял для стварэння адзінай пешаходнай сістэмы, што аб'яднала б гарадскі цэнтр са значнымі грамадскімі прасторамі, — заўважыла **Вікторыя МАЦВЯЙЧУК, кіраўнік праектаў, старшы выкладчык кафедры архітэктуры Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.** — Я хацела даць студэнтам не нейкія абстрактныя вучэбныя заданні, а такія, каб яны сваімі праектамі змаглі прынесці карысць гораду і зрабіць яго сваімі прапановамі лепшым.

Сярод мноства студэнцкіх прапаноў два праекты ўжо рэальна спадабаліся кіраўніцтву Наваполацка і, магчыма, з часам будуць рэалізаваны.

Напрыклад, сквер, які прылягае да вуліцы Дзяржынскага, студэнты вызначылі як адзін з цэнтраў прыцягнення людзей. Праз яго месцічы часта ходзяць на работу ці проста выбіраюць яго для шпацыру.

— Мы імкнуліся зразумець, як выкарыстоўваецца гэтая тэрыторыя. Аказалася, што хоць людзі і бываюць у ёй штодня, аднак пераважна толькі для транзіту, — расказалі студэнты.

Аўтары праекта вырашылі, што пры мінімальных выдатках у гэтай грамадскай прасторы трэба стварыць нешта такое, у што маглі б уцягнуцца мясцовыя жыхары. Галоўнай ідэяй пераўтварэння сквера стала стварэнне інтэрактыўных гульнявых зон. У прыватнасці, плануецца зрабіць настольныя гульні ў вялікім маштабе, якія аб'ядноўваюць людзей, вымусяць іх выйсці на вуліцу і камунікаваць.

— Гэта могуць быць нейкія простыя формы з натуральных матэрыялаў, якія можна стварыць самім. Падвесныя крэслы, гамакі, драўляныя гульнёвыя элементы накшталт паласы перашкод, — прапанавалі юныя трансфарматары.



Аўтар фота-карцінкі — студэнтка Ганна ПУТРЫНА.

Асноўную транзітную частку сквера вырашана зрабіць прагулачнай, але каб там хацелася не толькі прагуляцца, але і затрымацца.

Другі праект датычыцца тэрыторыі насупраць бізнес-цэнтра «Эдэм». Яна таксама найчасцей выкарыстоўваецца для транзіту. Зрабіць яе больш прывабнай прапануецца за кошт стварэння зоны ціхага адпачынку, або зоны grandparents, дзе людзі, старэйшыя за 50, маглі б пасядзець і згуляць у «настолкі». Для павышэння камерцыйнай прывабнасці тут можна стварыць участкі для вулічнай ежы, напрыклад, у выглядзе перасоўных вагончыкаў food truck. А простая вулічная мэбля дапаможа арганізаваць месцы, дзе можна будзе ладзіць пікнікі.

— Асноўная ідэя абодвух гэтых праектаў у тым, што людзей можна аб'ядноўваць яшчэ на стадыі будаўніцтва. Усе ідэі можна рэалізаваць сіламі людзей, што жывуць на гэтых тэрыторыях. Гэта дапаможа і з суседзямі лепш пазнаёміцца, і прымусіць ставіцца да створанага больш беражліва, — упэўнена кіраўнік праектаў.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**